3. ГАНИСО. – Ф. 1701. Оп. 1. Д. 3.
4. ГАНИСО. – Ф. 1886. Оп. 1. Д. 6.
5. Комаров, Д. Е. Население оккупированных территорий: между коллаборационизмом и сопротивлением (на материалах Смоленской области) / Д. Е. Комаров // Приволжский научный вестник. – 2012. – № 10. – С. 32–41.
6. Комаров, Д. Е. Смоленская область в огне Великой Отечественной: война, народ, победа / Д. Е. Комаров. – Смоленск : Свиток, 2015. – 368 с.

**Крыварот А.А.**

## БАЯВАЯ САДРУЖНАСЦЬ САВЕЦКІХ ПАРТЫЗАН БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ: ДАКУМЕНТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АРХІВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СВЕДЧАЦЬ

Звесткі пра арганізацыйнае і баявое ўзаемадзеянне беларускіх і ўкраінскіх партызан у гады Вялікай Айчыннй вайны знайшлі пэўнае адлюстраванне ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Асноўны масіў такіх дакументаў знаходзіцца ў справах фондаў № 4п вопіс 33а (дакладныя, справаздачы, спецпаведамленні і лісты партыйных, камсамольскіх, савецкіх работнікаў, кіраўнікоў партызанскіх атрадаў і груп) і № 1450 вопіс 4 (матэрыялы па баявой дзейнасці брыгад і атрадаў). Інфармацыя ў сваёй большасці храналагічна ахоплівае перыяд з лета 1942 да восені 1943 г. і ў геграфічным плане тэрыторыю Гомельскай, Палескай, Магілёўскай, Мінскай, Пінскай, а таксама часткова Арлоўскай (РСФСР) абласцей. Пры гэтым у некалькіх дакументах асвятляюцца кантакты савецкіх партызан суседніх рэспублік, якія мелі месца восенню – зімой 1941 г. як на тэрыторыі Беларусі, так і Украіны.

Адна з першых інфармацый аб садружнасці партызан Беларусі і Украіны датычыцца ўваходжання беларусаў-выпускнікоў Вучэбна-аператыўнага цэнтра Заходняга фронту, які знаходзіўся ў пасёлку Белыя Берагі Арлоўскай вобласці, у склад Пуціўльскага атрада Сумской вобласці пад камандаваннем С.А. Каўпака. У архіўных дакументах зафіксавана, што ў пачатку верасня 1941 г. выпускнікі колькасцю 104 чалавек прыбылі ў Пуціўльскі раён Сумской вобласці для пераходу лініі фронту. Большасць з іх улілася ў шэрагі Чырвонай арміі і разам з яе часцямі адступала на ўсход, частка дэзерціравала. Група колькасцю 7 чалавек: В.М. Астроўскі (былы фінансавы работнік Столінскага раёна), Р.Д. Кравец (ураджэнец Пінска), М.М. Курс (былы дырэктар школы ў Рэчыцкім раёне), Я.Л. Рахлін, А.Д. Фрэйдман, В.В. Цэрахаў, Г.А. Юхнавец (былы інструктар Баранавіцкага абкама КП(б)Б) з 9 верасня 1941 г. стала дзейнічаць у Пуціўльскім атрадзе. У архіўных матэрыялах адзначана, што члены групы ўнеслі значны ўклад у станаўленне атрада і разгортванне баявой дзейнасці. Так, М.М. Курс стаў першым начальнікам штаба атрада. Члены групы атрымалі ў Вучэбна-аператыўным цэнтры добрую дыверсійную падрыхтоўку і ўдзельнічалі ў многіх аперацыях. Групу мінёраў спачатку ўзначаліў М.М. Курс, а потым Г.А. Юхнавец. На баявым рахунку групы з 10 верасня 1941 г. да 1 мая 1942 г. 21 знішчаная машына з акупантамі і грузамі, чатыры падбітыя танкі, адзін паравоз, 14 вагонаў і тры платформы, шэсць разбураных чыгуначных і восем грунтовых мастоў. За праяўлены гераізм члены групы былі адзначаны высокімі ўзнагародамі: М.М. Курс і Г.А. Юхнавец – ордэнам Леніна, В.В. Цэрахаў – ордэнам Чырвонага Сцяга. У адным з дакументаў змешчана справаздача аб баявой дзейнасці групы, датаваная 31.01. 1943 г. [6, л. 276, 319–320; 7, л. 124–125].

Пра кантакты беларускіх атрадаў і ўкраінскіх патрыятычных груп восенню 1941 г. уЖытомірскай вобласці ёсць нешматлікія звесткі ў адным з дакументаў фонда 4п, воп. 33а. У справаздачы ідзе гаворка аб двух нападах на паліцэйскія ўчасткі. У першым выпадку быў налёт Лельчыцкага атрада на апорны пункт у вёсцы Войкевічы Алеўскага раёна. У другім выпадку 3 кастрычніка 1941 г. Лельчыцкім атрадам і групай Тураўскага раёна быў нанесены ўдар па акупантах у вёсцы Копішча ў тым жа раёне. Падчас бою было знішчана 25 акупантаў [4, л. 66].

На жаль, у фондах НАРБ да гэтага часу яшчэ не выяўлены дакументы, якія б сведчылі аб знаходжанні на тэрыторыі Нараўлянскага і Ельскага раёнаў Палескай вобласці першых украінскіх партызанскіх атрадаў – Карастаньскага (камандзір Дз.І. Марцінкоўскі) і Славечанскага (камандзір Т.Л. Грышын). Інфармацыя аб іх дзейнасці ўтрымліваецца ў архіве Жытомірскай вобласці [1, с. 351, 479].

У справах некалькіх фондаў НАРБ змешчаны дакументы са звесткамі аб дзейнасці на тэрыторыі Гомельскай, Магілёўскай, Палескай і Арлоўскай абласцей з мая 1942 да восені 1943 г. Чарнігаўскага атрада (з 28 ліпеня 1942 г. – злучэння атрадаў) пад камандаваннем А.Ф. Фёдарава, якія раскрываюць узаемаадносіны гэтага фарміравання з беларускімі партызанамі. Да чэрвеня 1943 г. злучэнне называлася Чарнігаўскім, а затым Чарнігаўска-Валынскім [19, с. 463]. У адным з такіх дакументах ёсць інфармацыя аб чатырох дыверсіях груп Чарнігаўскага атрада ў канцы мая 1942 г. на камунікацыях вакол Гомельскага транспартнага вузла, найперш на чыгуначнай лініі Гомель – Навазыбкаў. Свае аперацыі ўкраінскія партызаны праводзілі ўзгоднена з беларускімі падраздзяленнямі, якія ў той час апервавалі ў асноўным на шашэйных дарогах. Падчас удару 26 мая 1942 г. група Чарнігаўскага атрада правяла буйную дыверсію паміж станцыямі Закапыцце – Добруш і пусціла пад адхон эшалон у складзе двух паравозаў, 48 вагонаў і цыстэрн з палівам і запаснымі часткамі для самалётаў. У гэты

самы дзень яшчэ адна група падарвала чыгуначнае палатно на лініі Гомель – Злынка. У інфармацыі аб дыверсіях 29 і 30 мая 1942 г. па кожнай аперацыі паказаны агульныя вынікі аб падарваных паравозах, вагонах, платформах, знішчаных акупантах [5, л. 5].

Другі этап знаходжання чарнігаўскіх партызан на чале з А.Ф. Фёдаравым на Гомельшчыне і ўзаемадзеяння з беларускімі атрадамі звязаны з рэйдам ў другой палове жніўня 1942 г. злучэння ў Чачэрскаім раёне. У фондах 4п і 1450 ёсць больш за дзесяць дакументаў, у якіх асвятляюцца падзеі згаданага перыяду. Падчас карнай аперацыі сіламі 221-й нямецкай ахоўнай дывізіі ў трэцяй дэкадзе ліпеня 1942 г. акупантам удалося заняць тэрыторыю Чачэрскай зоны. Атрады зоны былі часткова рассеяны праціўнікам. Пасля першых баёў з карнікамі камандаваннем штабу зоны (кіраўнік – камандзір чэкісцкага атрада П.Р. Шамякін, камісар – сакратар Гомельскага падпольнага абкама КП(б)Б А.А. Куцак) было прынята рашэнне, што падраздзяленне П.Р. Шамякіна павінна выйсці ў клятнянскія лясы, а мясцовыя атрады застацца ў Чачэрскіх лясах. Ёсць дакументальныя звесткі, што камандзір Чарнігаўскага злучэння А.Ф. Фёдараў пасля прыбыцця ў Чачэрскі раён валявым рашэннем уключыў у свой склад групы партызан Чачэрскага (камандзір П.А. Балыкоў) і Свяцілавіцкага (камандзір І.М. Філіпаў) атрадаў, а затым з прычыны наступу вялікай групоўкі праціўніка з боку Гомеля вывеў партызанскія сілы ў бок Клятнянскага і Мглінскага раёнаў Арлоўскай вобласці. Беларускім партызанам, д алучаным да Чарнігаўскага злучэння, на шапках нашываліся чырвоныя стужкі, як знак таго, што з гэтага часу яны з'яўляюцца ўкраінскімі байцамі [2, л. 48–49; 8, л. 45, 47, 48; 9, л. 28].

Пэўную цікавасць уяўляюць дакументы, якія раскрываюць матывацыю дзеянняў А.Ф. Фёдарава па ўключэнні беларускіх атрадаў і груп у склад Чарнігаўскага злучэння і адносіны да такога яго ўчынку Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР), Гомельскага падпольнага абкама КП(б)Б, камандавання падраздзяленняў шэрагу раёнаў Гомельскай вобласці. Камандзіры мясцовых атрадаў П.А. Балыкоў, А.І. Ушаў, І.М. Філіпаў напачатку адмовіліся з'явіцца ў штаб Чарнігаўскага злучэння, матывуючы гэта тым, што ім пастаўлена задача аперыраваць ў сваіх раёнах. Аднак пасля паўторнага загаду А.Ф. Фёдарава Чачэрскі і Свяцілавіцкі атрады колькасцю 130 чалавек і 80 чалавек адпаведна былі вымушаны ўвайсці ў склад злучэння і перамясціцца ў жніўні – верасні 1942 г. у клятнянскія лясы Арлоўскай вобласці. Кармянскі атрад (камандзір А.І. Ушаў) колькасцю 20–25 чалавек перамясціўся туды некалькі пазней. Пры гэтым А.І. Ушаў, вярнуўшыся па прапанове А.Ф. Фёдарава ў Чачэрскі і Кармянскі раёны для збору і перамяшчэння ў клятнянскія лясы астаніх парызан, застаўся на тэрыторыі Гомельшчыны дзейнічаць супраць акупантаў. Да канца 1942 г. А.І. Ушаву ўдалося сабраць падраздзяленне колькасцю да 60 байцоў. Кіраўніцтва (БШПР) і Гомельскі абкам КП(б)Б лічылі правільным вярнуць атрады ў раёны ранейшай дыслакацыі і неаднаразова рабілі захады для станоўчага вырашэння праблемы [2, л. 48–49, 62; 10, л. 8аб].

Для асэнсавання сутнасці пытання звяртае на сябе ўвагу адзін з дакументаў, у якім паведамляецца, што падчас сустрэчы с кіраўніцтвам штаба Чачэрскай зоны на тэрыторыі Магілёўскай вобласці 25 верасня 1942 г. А.Ф. Фёдараў заявіў аб наяўнасці ў яго паўнамоцтваў на кіраўніцтва партызанскім рухам у Чарнігаўскай і Гомельскай абласцях. Пры гэтым 28 верасня 1942 г. на нарадзе з удзелам А.Ф. Фёдарава было прынята рашэнне стварыць Гомельскае злучэнне на чале з А.А. Куцаком, аднак пазней пытанне аб вяртанні беларускіх атрадаў на месца ранейшай дыслакацыі так і не было вырашана. Яшчэ ў адным дакуменце, дзённіку прадстаўніка ЦК КП(б)Б і БШПР, сакратара падпольнага абкама ЛКСМБ І.Я. Палякова, адзначана, што ў другой палове снежня 1942 г. – студзені 1943 г. у клятнянскіх лясах, ён неаднаразова спрабаваў вярнуць атрады ў ранейшыя раёны дыскалацыі. Аднак кіраўніцтва Чарнігаўскага злучэння не выяўляла жадання вырашаць гэтую праблему. Гомельскія атрады, акрамя Свяцілавіцкага, вярнуліся на тэрыторыю Беларусі ў лютым 1943 г. пасля выхаду з акружэння падчас карнай аперацыі ў клятнянскіх лясах [2, л. 62, 108; 3, л. 136; 10, л. 28–32].

У масіве дакументаў фонда 1450 вопісу 4 асветлены шматлікія кантакты партызан Гомельскай і Палескай абласцей з рэйдавымі ўкраінскімі злучэннямі С.А. Каўпака і А.М. Сабурава, якія перамясціліся ў Беларускае Палессе на пачатку лістапада 1942 г. пасля фарсіравання Дняпра ў раёне Лоева. Па сведчанні архіўных матэрыялаў, камандаванне вялікіх па колькасці і добра ўзброеных злучэнняў з першых дзён базіравання на беларускай тэрыторыі ўстанавілі кантакты з мясцовымі партызанамі. Адзначаюцца наступныя формы ўзаемадзеяння: дапамога з боку ўкраінскіх партызан зброяй, сувяззю з цэнтрам, інфармацыйнымі матэрыяламі, а таксама сумесныя баявыя аперацыі. Так, атрады Гомельскай вобласці «Бальшавік», Лоеўскі «За Радзіму», Рэчыцкі імя К.Я. Варашылава атрымалі ў сярэдзіне лістапада 1942 г. ад злучэння С.А. Каўпака тры радыёстанцыі, станкавы кулямёт, два процітанкавыя ружжы, некалькі аўтаматаў і вялікую колькасць ручных гранат [11, л. 10].

Нямала звестак у архіўных дакументах аб дапамозе з боку ўкраінскіх рэйдавых злучэнняў беларускім атрадам у арганізацыйным умацаванні сваіх структур. Ельскі атрад (камандзір А.С. Мішчанка) з 23 лістапада 1942 г. на працягу двух з паловай месяцаў дзейнічаў разам са злучэннем С.А. Каўпака як аўтаномная баявая адзінка. Сумесна з ўкраінскімі атрадамі беларускія партызаны ўдзельнічалі ў аперацыях і выкананні іншых заданняў. 23 снежня 1942 г. каля вёскі Глушкавічы Лельчыцкага раёна

атрад сумесна з 3-ім батальёнам Каўпака вёў больш за трохгадзінны бой з карнікамі. Падкрэслена, што за гэтыя два месяцы Ельскі атрад узбагаціўся баявым вопытам, вырас колькасна і ўмацаваўся арганізацыйна. У канцы студзеня 1943 г. падраздзяленне налічвала 230 чалавек і падрыхтавала вялікую колькасць людзей, якія гатовы былі далучыцца да атрада [12, л. 5аб, 6; 15, л. 11, 35].

З дакументаў вынікае, што прыкметны ўплыў на разгортванне ўзброенага супраціўлення ворагу на паўднёвым захадзе Гомельшчыны аказала і злучэнне А.М. Сабурава. Некалькі месяцаў у склад злучэння ў якасці самастойнай адзінкі ўваходзіў Лельчыцкі атрад (камандзір І.А. Колас). Баявы вопыт беларускае падраздзяленне набірала ў сумесных баях з украінскімі партызанамі па разбурэнні камунікацый і разгроме апорных пунктаў захопнікаў у Лельчыцкім, Петрыкаўскім, Мазырскім раёнах. Пастаянны колькасны рост Лельчыцкага атрада дазволіў у будучым выдзяляць арганізатарскія групы для разгортвання партызанскага руху ў Петрыкаўскім, Жыткавіцкім і Тураўскім раёнах [16, л. 51аб, 55].

Найбольшая колькасць дакументальных звестак аб узаемадзеянні беларускіх і ўкраінскіх партызан датычыцца сумесных удараў па ваенна-паліцэйскіх гарнізонах і іншых тылавых апорных пунктах праціўніка на тэрыторыі Гомельскай і Палескай абласцей. Па зробленых падліках у перыяд з лістапада 1942 па студзень 1943 г. беларускія атрады і злучэнні С.А. Каўпака і А.М. Сабурава правялі баявыя аперацыі супраць 15 тылавых аб'ектаў, у тым ліку па гарнізонах у райцэнтрах Лельчыцы і Хойнікі, станцыі Дзямехі, дзе захоўваліся значныя запасы харчоў, абмундзіравання, зброі, медыкаментаў, што было важна для забеспячэння ўкраінскіх партызан перад рэйдамі на тэрыторыю Правабярэжнай Украіны [12, л. 6; 15, л. 11, 35; 16, л. 50аб; 17, л. 5–6]

Вясной – летам 1943 г., калі на тэрыторыі Беларускага Палесся базіраваліся больш за 10 партызанскіх злучэнняў, у розных раёнах Гомельшчыны былі праведзены сумесныя напады на дзясяткі гарнізонаў. Аб'ектамі ўдараў станавіліся такія важныя для акупацыйнага рэжыму апорныя пункты, як Брагін, Піркі, Скрыгалаў, Давыд-Гарадок, Казенкі, Тураў, Нароўля [13, л. 29; 14, л. 32аб; 17, л. 12, 23–24; 18, л. 17, 17аб, 18–20].

Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь сведчаць, што баявая садружнасць савецкіх партызан Беларусі і Украіны ўключала арганізацыйнае ўмацаванне партызанскіх фарміраванняў, баявыя аперацыі на камунікацыях, удары па гарнізонах, барацьбу супраць карных аперацый і інш. Узаемадзеянне ажыццяўлялася на тэрыторыі Беларускага і Украінскага Палесся, а таксама Арлоўскай вобласці РСФСР.


1. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева [и др.] ; редкол.: А.Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 3. – 1985. – 531 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 9.
3. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 68.
4. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 79.
5. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 162.
6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 165.
7. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 174.
8. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 182.
9. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 249.
10. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4 Спр. 250.
11. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 260.
12. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 269.
13. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 270.
14. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 271.
15. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 278.
16. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 283.
17. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 288.
18. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 289.
19. Партизанські колекції Меморіального комплексу «Національний музей історії Великої Вітчизняної війни 1941–1945 років». Особові фонді. Путівник. – К. : Аеростат, 2014.– 552 с.


**Корсак А.И.**

## ДНЕВНИК ПАРТИЗАНСКОГО ОТРЯДА М.Ф. ШМЫРЁВА: ИСТОЧНИКОВЕДЧЕСКИЙ АНАЛИЗ

История советского партизанского движения изучается исследователями, как правило, на основе архивных материалов Белорусского и Центрального штабов партизанского движения. Безусловно, это огромным пласт документов, которые в полной мере раскрывают основные моменты боевой деятельности партизанских формирований, трудности и проблемы, связанные с комплектование составов и обеспечением продовольствием и т.д. Но наименее, на наш взгляд, изученный период в становлении партизанского движения на территории Беларуси является 1941 г. – начало 1942 г. Когда сформированные партизанские отряды не имели должного опыта не только в ведении боевых действий, но и не имели практики конспиративной работы. Это время ошибок, накопления знаний и опыта.